4. *Волгушева, А. А.* Учебно-методический процесс [Электронный ресурс] / А. А. Волгушева // Center-YF : Центр управления финансами. – М. : ЦУФ, 2009–2020. – Режим доступа: https://center-yf.ru/data/stat/uchebno-metodicheskiy-process.php. – Дата доступа: 13.02.2020.

5. Об учебно-методическом комплексе на уровне высшего образования : постановление Мин-ва образования Респ. Беларусь, 26 июля 2011 г., № 167 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 133. – 8/24424. – С. 59–63.

6. Положение об учебно-методическом комплексе по учебной дисциплине : утв. приказом ректора университета, 26 апр. 2017 г., № 69. – Минск : БГУКИ, 2017. – 15 с.

7. Положение об электронном учебно-методическом комплексе по дисциплине для высших учебных заведений Респ. Беларусь [Электронный ресурс] : утв. Мин-вом образования Респ. Беларусь, 29 дек. 2008 г. – Режим доступа: https://edu.gov.by/sistema-obrazovaniya/glavnoe-upravlenieprofessionalnogo-obrazovaniya/dop-obr/rukovoditelyu/index.php?sphrase_id=139660. – Дата доступа: 03.02.2020.

8. Электронные библиотеки [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / сост. Т. С. Юхновец. – Электронные текстовые данные. – Минск, 2019. – 97 с. ; табл. – Режим доступа: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/20965/ELEKTRONNYE%20BIBLIOTEKI.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Заглавие с экрана. – Депонировано в БГУКИ 27.11.2019, № 040727112019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**М. А. Яцэвіч,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

# АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ ВА УКРАІНЕ (па выніках замежнай стажыроўкі)

Стан адукацыі ў кожнай краіне залежыць ад шэрагу аб'ектыўных фактараў: палітычных, сацыяльна-эканамічных, міжнародных, дэмаграфічных і інш. Ва Украіне з 2020 г. пачаўся новы этап рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі. Штуршком да гэтага стаў Закон 392-IX «Аб унясенні змяненняў у заканадаўства адносна вышэйшай адукацыі», які прыняты Вярхоўнай Радай Украіны 18.12.2019 г. [3]. Змены ўнесены ў закон Украіны «Аб вышэйшай адукацыі» 2014 г. [1]. Закон істотна змяняе сістэму вышэйшай адукацыі краіны, набліжае

яе да еўрапейскай, стварае ўмовы да поўнавартаснага ўваходжання Украіны ў Балонскі працэс, удзельнікам якога яна стала яшчэ ў 2005 г.

Аналіз дакумента паказвае, што яго рэалізацыя можа дазволіць:

– адмяніць абязковае дзяржаўнае ліцэнзаванне на многія спецыяльнасці, пакінуйшы яго для спецыяльнасцей у базавых сферах: атамнай энергетыцы, медыцыне, ваеннай справе і інш.; увесці анлайн ліцэнзаванне;

– выдаваць дыпломы аб адукацыі не толькі дзяржаўнага ўзору, але і па ўзору, зацверджанаму вучоным саветам вышэйшай навучальнай установы;

– увесці новыя крытэрыі фінансавання сферы вышэйшай адукацыі;

– упарадкаваць сетку вышэйшых навучальных устаноў;

– праводзіць выбары і заключаць кантракты з рэктарамі ўстаноў вышэйшай адукацыі з улікам мэтавых паказчыкаў эфектыўнасці іх дзейнасці і тэрмінаў выканання;

– укараніць дуальную сістэму адукацыі;

– увесці матывацыйныя пісьмы для абітурыентаў з мэтай больш якаснага і профільнага іх адбору (з магчымым дабаўленнем балаў пры паступленні);

– разглядаць плагіят і фальсіфікацыі як адну з прычын для адлічэння студэнтаў.

Зразумела, што фінансаванне з’яўляецца самым галоўным у развіцці вышэйшай адукацыі. Да гэтага часу ва Украіне (як цяпер у Беларусі) фінансаванне залежыла амаль што на сто працэнтаў ад колькасці студэнтаў. Вышэйшыя навучальныя ўстановы імкнуліся любымі намаганнямі захаваць кантынгент студэнтаў, часта не гледзячы на іх здольнасць засвойваць адукацыйныя праграмы. З 2020 г. Міністэрства адукацыі і навукі Украіны распрацавала новую сістэму фінансавання вышэйшых навучальных устаноў.

Яна складаецца з шасці асноўных паказчыкаў: 1) рэгіянальны каэфіцыент (для Кіева ён складае 1, для ўніверсітэтаў Харкава і Львова – 1,03, для астатніх – 1,07); 2) маштаб універсітэта (тыя ўніверсітэты, якія аб’ядноўваюцца, могуць атрымаць большае фінансаванне); 3) колькасць студэнтаў (з паступовым паніжэннем гэтага паказчыка да 50 %, але дыферэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыравана для ўніверсітэтаў рознага профілю); 4) атрыманне грантаў і інвестыцый (дзяржава павінна вітаць гэта і падтрымліваць); 5) улік міжнародных рэйтынгаў устаноў вышэйшай адукацыі (большы рэйтынг – большы каэфіцыент фінансавання); 6) працаўладкаванне выпускнікоў па спецыяльнасці і замацаванне іх на працоўных месцах (больш фінансавання тым універсітэтам, хто здолее гэтага дасягнуць) [3].

Закон Украіны «Аб вышэйшай адукацыі» [2] устанаўлівае асноўныя ўзроўні падрыхтоўкі спецыялістаў па адпаведных адукацыйных або навуковых праграмах:

– пачатковы ўзровень (кароткі цыкл) вышэйшай адукацыі (набыццё асобай пэўнай агульнакультурнай і прафесійна арыентаванай падрыхтоўкі, спецыяльных уменняў і ведаў, а таксама пэўнага вопыту іх практычнага прымянення для выканання тыповых задач, прадугледжаных для першасных пасад у адпаведнай прафесійнай сферы дзейнасці; 120-150 ECTS крэдытаў; кваліфікацыя – малодшы бакалаўр);

– першы (бакалаўрскі) узровень (набыццё асобай тэарэтычных ведаў і практычных уменняў і навыкаў, дастатковых для паспяховага выканання прафесійных абавязкаў па абранай спецыяльнасці; 180–240 балаў ECTS; кваліфікацыя – бакалаўр);

– другі (магістарскі) узровень (набыццё асобай паглыбленых тэарэтычных і/або практычных ведаў, уменняў, навыкаў па абранай спецыяльнасці (або спецыялізацыі), агульных асноў метадалогіі навуковай і/або прафесійнай дзейнасці, іншых кампетэнцый, дастатковых для эфектыўнага выканання задач інавацыйнага характару адпаведнага ўзроўню прафесійнай дзейнасці; аб'ём адукацыйна-прафесійнай праграмы – 90–120 крэдытаў ECTS, аб'ём адукацыйна-навуковай праграмы – 120 крэдытаў ECTS; кваліфікацыя – магістр);

– трэці (адукацыйна-навуковы) узровень (атрыманне тэарэтычных ведаў, уменняў, навыкаў і іншых кампетэнцый, дастатковых для распрацоўкі новых ідэй, вырашэння комплексных задач у галіне прафесійнай і/або эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, засваення метадалогіі навукова-педагагічнай дзейнасці, а таксама правядзення ўласнага навуковага даследавання, вынікі якога павінны мець навуковую навізну, тэарэтычную і практычную значнасць; абарона дысертацыі ў спецыялізаваным вучоным савеце; навуковая ступень – доктар філасофіі);

– навуковы ўзровень (набыццё кампетэнцый па распрацоўцы і ўкараненні метадалогіі і методыкі даследаванняў, стварэння новых сістэмных ведаў і/або прагрэсіўных тэхналогій, вырашэння важнай навуковай ці прыкладнай праблемы нацыянальнага ці сусветнага значэння; абарона дысертацыі ў спецыялізаваным вучоным савеце; навуковая ступень – доктар навук).

Названыя заканадаўчыя акты непасрэдна звязаныя з вышэйшай бібліятэчнай адукацыі. Два гады таму назад ва Украіне ўстановы вышэйшай адукацыі перайшлі на падрыхтоўку спецыялістаў па інтэграванай спецыяльнасці «інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная справа» ўзамен спецыяльнасці «кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Інтэграванасць з’яўляецца адметнай рысай падрыхтоўкі бібліятэкараў у эканамічна развітых краінах свету. Напрыклад, у ЗША такая спецыяльнасць называецца «інфарматыка і бібліятэказнаўства».

Стандарт вышэйшай адукацыі Украіны па спецыяльнасці «інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная справа» для першага (бакалаўрскага) узроўню вышэйшай адукацыі зацверджаны і ўведзены ў сілу загадам Міністэрства адукацыі і навукі ад 12 снежня 2018 г., № 1378. Згодна з ім, аб’ектамі прафесійнай дзейнасці выпускніка з’яўляюцца «ўстановы і інфраструктура, якія забяспечваюць стварэнне, распаўсюджванне, захоўванне, архіваванне, доступ да інфармацыі і ведаў ва ўсіх фарматах; тэорыі, працэсы, тэхналогіі і стандарты, якія спрыяюць фарміраванню, абслугоўванню і выкарыстанню інфармацыйных рэсурсаў установамі, бібліятэкамі і архівамі» [4].

Інтэграваная спецыяльнасць мае свае перавагі: 1) інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная сферы дзейнасці з’яўляюцца памежнымі, яны выкарыстоўваюць падобныя методыкі і тэхналогіі фарміравання, стварэння, захоўвання і выкарыстання інфарацыйных рэсурсаў, абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі і г. д.; 2) у апошняе дзесяцігоддзе (а ў краінах Захаду значна раней) сталі ствараецца гібрыдныя ўстановы сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый – бібліятэкі-архівы, бібліятэкі-музеі, медыятэкі, электронныя бібліятэкі і інш.; 3) магчымасць падрыхтоўкі спецыяліста ва ўмовах класічнага ўніверсітэта; 4) змяншэнне фінансавых выдаткаў у параўнанні, калі б падрыхтоўка адбывалася паасобку; 5) самае галоўнае – больш шырокія магчымасці працаўладкавання выпускніка на рынку працы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з прафарыентацыйным сайтам «Вступ.ОСВІТА.UA», у 2020 г. 40 вышэйшых навучальных устаноў Украіны самага рознага профілю будуць ажыццяўляць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная справа». Усе яны маюць разнастайныя адукацыйныя праграмы, што вызначаецца самой установай. У 17 з іх назва адукацыйнай праграмы цалкам супадае з назвай спецыяльнасці і толькі ў 3-х адукацыйныя праграмы больш набліжаны да бібліятэчнай справы:

– бібліятэказнаўства і інфармацыйна-аналітычная дзейнасць (Харкаўская дзяржаўная акадэмія культуры);

– кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфія (Роўненскі дзяржаўны гуманітарны ўніверсітэт);

– менеджмент бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і тэхналогій (Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт культуры і мастацтваў).

У астатніх навучальных установах па разглядаемай спецыяльнасці існуюць самыя разнастайныя адукацыйныя праграмы: архівістыка і кіраванне дакументацыяй; дакументазнаўства і інфармацыйная дзейнасць; дакументна-інфармацыйнае суправаджэнне кадравай работы; інфармацыйная аналітыка і PR-тэхналогіі; інфармацыйная аналітыка і сувязь з грамадскасцю; інфармацыйна-аналітычная дзейнасць, дакументазнаўства; інфармацыйная і дакументацыйная дзейнасць; інфармацыйная дзейнасць у сферы бізнесу, палітыкі і ўрада; кіраванне архівамі і дакументамі; кіраванне сацыяльна-камунікацыйнымі сеткамі, інтэрнэт-маркетынг; кіраванне дакументацыяй і інфармацыйна-аналітычнай дзейнасцю; кіраванне дакументацыйнымі працэсамі і навукова-тэхнічны пераклад; кіраванне інфармацыйна-аналітычнай дзейнасцю і сувязі з грамадскасцю; кіраванне інфармацыйнымі камунікацыямі; дакументазнаўства, менеджмент дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання; сацыяльныя камунікацыі і інфармацыйная дзейнасць.

Відавочна, спецыялістаў рыхтуюць шматлікія вышэйшыя навучальныя ўстановы самага рознага профілю і форм уласнасці ў адрозненні ад Беларусі і Расіі, дзе гэта пераважна адбываецца адпаведна ва ўніверсітэце і інстытутах культуры. Такі падыход дазваляе больш прафілізавана весці падрыхтоўку кадраў для розных тыпаў і відаў бібліятэк, архіваў і інфармацыйных службаў. Трэба, аднак, адзначыць, што наборы ў кожнай з устаноў адукацыі невялікія: 10–20 чалавек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асабліва спрыяльна падрыхтоўка «інтэграванага спецыяліста» ва ўмовах класічнага ўніверсітэта, які мае для гэтага ўсё неабходнае: трывалую матэрыяльна-тэхнічную базу, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, навуковую бібліятэку, профільную кафедру, выкладчыкаў з іншых кафедраў. Практыка падрыхтоўкі такога спецыяліста была падрабяна разгледжана ў Львоўскім нацыянальным універсітэце імя Івана Франка, на кафедры бібліятэказнаўства і бібліяграфіі факультэта культуры і мастацтваў падчас праходжання вучэбнай стажыроўкі.

Львоўскі нацыянальны ўніверсітэт (ЛНУ) – адзін са старэйшых універсітэтаў Еўропы. Ён бярэ свой пачатак з 1661 г. Сёння ў ім навучаецца каля 20 тыс. студэнтаў па 52 спецыяльнасцях бакалаўрыята, 55 – магістратуры, 9 – асветніцка-прафесійнага ўзроўню. Працуюць 19 факультэтаў, 142 кафедры, 3 каледжы (педагагічны, юрыдычны, прыродазнаўчых навук з прысваеннем кваліфікацыі «малодшы спецыяліст»; звыш 700 навучэнцаў). Вучэбны і навукова-даследчы працэс забяспечваюць 1 144 кандыдата навук, 229 дактароў навук, 816 дацэнтаў, 210 прафесараў. У навукова-даследчай частцы працуе 150 чалавек. Універсітэт трэці ва Украіне па маштабах фінансавання. Факультэт культуры і мастацтваў (6 кафедраў) нагадвае сабой Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў у мініяцюры [1].

Да цяперашняга часу падрыхтоўкана кафедры бібліятэказнаўства і бібліяграфіі ЛНУ ажыццяўляецца як па новай спецыяльнасці «інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная справа», так і па спецыяльнасці «Кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфія», па якой завяршаюць навучанне студэнты старэйшых курсаў. Гэта ўносіць пэўныя цяжкасці ў арганізацыю вучэбнага працэсу і яго вучэбна-метадычнае забеспячэнне. У прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры ўваходзяць прафесары, дацэнты, старшыя выкладчыкі і асістэнты, якія маюць базавую адукацыю і вучоныя ступені ў галіне філалагічных, гістарычных, педагагічных навук, а таксама па новай навуковай спецыяльнасці – сацыяльныя камунікацыі. Да выкладання на кафедры далучаюцца спецыялісты з бібліятэк і архіваў, а таксама з іншых кафедраў універсітэта.

На кафедры функцыянуюць два ўзроўні вышэйшай адукацыі: бакалаўрыят (4 гады навучання) і магістратура (2 гады) з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прысваеннем кваліфікацыі адпаведна «бакалаўр» і «магістр». Студэнты маюць права выбару вучэбных дысцыплін падчас асваення адукацыйных праграм.

Выкладанне вядзецца па наступных асноўных блоках вучэбных дысцыплін бакалаўрыята:

– інфармацыйна-камунікацыйныя і інфармацыйна-рэсурсныя дысцыпліны («Базы даных навуковых інфармацыйных рэсурсаў і навукаметрыя», «Дакументазнаўства», «Інфармацыйныя сістэмы і сеткі», «Інфармацыйныя тэхналогіі ў бібліятэках і інфармацыйныя сэрвісы», «Тэорыя сацыяльных камунікацый» і інш.);

– кнігазнаўчыя дысцыпліны («Кнігазнаўчая практыка Івана Франка», «Практыка кніжных памятнікаў», «Спецыяльныя бібліятэчныя зборы»);

– бібліятэказнаўчыя дысцыпліны («Бібліятэказнаўства», «Арганізацыя бібліятэчнай справы», «Асновы бібліяпсіхалогіі», «Гісторыя бібліятэчнай справы замежных краін», «Гісторыя бібліятэчнай справы Львоўшчыны» і інш.)

– бібліяграфазнаўчыя дысцыпліны («Бібліяграфічнае апісанне дакументаў», «Гісторыя сусветнай бібліяграфіі», «Гісторыя ўкраінскай бібліяграфіі», «Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліяграфіі» і інш.);

– архівазнаўчыя і кнігавыдавецкія дысцыпліны («Асновы архівазнаўства», «Асновы кнігавыдавецкай і паліграфічнай справы», «Методыка работы з архіўнымі дакументамі»).

Адукацыйная праграма магістарскай падрыхтоўкі прадстаўлена дысцыплінамі: «Актуальныя праблемы сучаснага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства», «Магістарскі семінар (029 Інфармацыйная, бібліотечная і архіўная справа)», «Асновы навуковага тэксту», «Асновы навуковых даследванняў», «Метадалогія педагагічных даследванняў», «Тэорыя і метадалогія сацыяльнага праектавання», «Методыка выкладання дысцыплін вышэйшай школы», «Менеджмент інфармацыйных рэсурсаў» і інш.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне кафедры складаецца з рабочых праграм вучэбных дысцыплін, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, зборнікаў тэстаў па асобных дысцыплінах, зборнікаў тэстаў для паступаючых у магістратуру з непрофільнай адукацыяй, метадычных указанняў для студэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таў, праграм практык. Усё гэта прадстаўлена ці ў рукапісным, ці ў друкаваным выглядзе. Вялікая ўвага надаецца выданню тэстаў, напрыклад: «Книгознавство, бібліотекознавство, бібліографія: збирник текстовых завдань для комплексної перевиркі знань студентів» (2017). Агульныя вучэбна-метадычныя комплексы па выкладаемых дысцыплінах, як гэта практыкуецца ў БДУКМ, не складаюцца.

Можна зрабіць некаторыя параўнальныя высновы:

1. Сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў ва Украіне значна адрозніваецца ад беларускай. Гэта тлумачыцца рознай заканадаўчай базай. Ва Украіне яна поўнасцю накіравана на Балонскі працэс.

2. Змест падрыхтоўкі спецыялістаў на розных узроўнях адукацыі ў многім супадае, гэта – агульнасусветная тэндэнцыя. Але ва Украіне ёсць большая магчымасць выбару і варыятыўнасці адукацыйных праграм па інтэграванай спецыяльнасці «інфармацыйная, бібліятэчная і архіўная справа», а вучэбны працэс менш заарганізаваны.

3. Падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў ва ўмовах класічнага ўніверсітэту мае свае перавагі ў параўнанні з інстытутамі культуры. Існуе большая магчымасць прафілізацыі навучання, далучэння да вучэбнага працэсу спецыялістаў з самых разнастайных навуковых напрамкаў, напрыклад, у галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, архіўнай справы і г. д.

---

*1.* Львівський університет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.lnu.edu.ua. – Дата доступа: 15.01.2020.

*2.* О высшем образовании [Электронный ресурс] : Закон Украины от 01.07.2014 г., № 1556. – Режим доступа: https://kodeksy.com.ua/ka/o_vysshem_obrazovanii.htm. – Дата доступа: 15.01.2020.

*3.* Про внесення змін до деяких законів України щодо вдосконалення освітньої діяльності у сфері вищої освіти [Электронны рэсурс] : Закон України : документ 392-IX, чинний, поточна редакція, прийняття від 18.12.2019. – Режим доступа: https://zakon.rada.gov.ua/laws/show/392-20. – Дата доступа: 12.01.2020

*4.* Стандарт вищої освіти України за спеціальністю «Інформаційна, бібліотечна та архівна справа» для першого (бакалаврського) рівня вищої освіти затверджений і введений в дію наказом Міністерства освіти і науки № 1378 від 12 грудня 2018 року [Электронны рэсурс]. – Режим доступу: https://ru.osvita.ua/consultations/spec-bach/63097/. – Дата доступу: 15.01.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ